# Заснаванне і станаўленне вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь

**Статыстычная даведка**

Бібліятэчная сістэма Рэспублікі Беларусь уключае каля 10 тыс. публічных і спецыяльных бібліятэк з сукупным аб'ёмам фонду каля 250 млн экзэмпляраў. Самай буйной з'яўляецца бібліятэчная сетка Міністэрства культуры (3986 бібліятэк), узначальвае якую Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Сетка навукова-тэхнічных бібліятэк налічвае 469, медыцынскіх – 180, прафсаюзных – 240, школьных – 3840, воінскіх часцей – 98, аграпрамысловага комплексу – 80, ВНУ – 57, царкоўных – 342, акадэмічных – 12 бібліятэк. У бібліятэках краіны працуюць каля 17 тыс. спецыялістаў, у тым ліку каля 9 тыс. – у бібліятэках сістэмы Міністэрства культуры. 72,5% спецыялістаў маюць вышэйшую адукацыю [1, с. 58, 59]. Толькі за апошнія тры гады (2006–2008) Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў падрыхтаваў 563 спецыялісты з прысваеннем 6 кваліфікацый: бібліятэкар-бібліёграф, менеджэр; бібліятэкар-бібліёграф, таваразнаўца; бібліятэкар-бібліёграф, спецыяліст па аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэмах; бібліятэкар-бібліёграф, перакладчык; бібліятэкар-бібліёграф, выкладчык; бібліятэкар-бібліёграф, спецыяліст па інфармацыі.

Факультэту інфармацыйна-дакументных камунікацый універсітэта ў гэтым годзе спаўняецца 65 гадоў. У кастрычніку адзначалася і 65 гадоў з дня заснавання бібліятэчнай адукацыі.

Бібліятэка як старажытны інстытут пісьменства, асветы, культуры, адукацыі заўсёды займала адно з важнейшых месцаў у жыцці грамадства. Прафесія бібліятэкара зарадзілася на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў XI стагоддзі, адначасова з узнікненнем бібліятэк пры манастырах і царквах. Гэтаму садзейнічалі ідэі асветніцтва, якія заўсёды віталі ў грамадстве і падтрымліваліся славутымі прадстаўнікамі духоўнай спадчыны. Найстаражытнейшай з бібліятэк лічыцца бібліятэка Сафійскага сабора, у якой Еўфрасіння Полацкая не толькі перапісвала кнігі і летапісы, але і зберагала іх дзеля будучыні, ратавала ад забыцця, клапацілася аб асветніцтве грамадства.

Пры ўваходзе беларускіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага пісьменнасць атрымлівае далейшае распаўсюджванне, зараджаецца і развіваецца беларускае кнігадрукаванне (на кірыліцы), ідзе інтэнсіўнае стварэнне царкоўных бібліятэк. Ужо ў другой палове XVI стагоддзя такія бібліятэкі з'явіліся ў Вільні, Полацку, Слуцку, Мінску, Магілёве. Найбольш багатыя зборы кніг, асабліва рукапісных, – у бібліятэках Супрасльскага, Слуцкага, Троіцкага, Жыровіцкага, Віцебскага, Маркаўскага і іншых манастыроў. Самыя багатыя і вядомыя прыватныя кнігазборы ў XVI–XVIII стагоддзях належалі родам Радзівілаў, Сапегаў, Хадкевічаў, Храптовічаў.

У XIX стагоддзі мяняюцца характар і накіраванасць кнігадрукавання. Сярод друкаванай прадукцыі пераважаюць кнігі свецкага зместу, пашыраецца іх тэматыка, ствараецца вучэбная, мастацкая, навукова-папулярная літаратура. Вялікую ролю ў распаўсюджванні перадавой рускай і замежнай навукі і літаратуры пачынаюць выконваць бібліятэкі пры навучальных установах, пазней – публічныя бібліятэкі ў губернскіх гарадах Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1913 годзе на тэрыторыі Беларусі налічвалася каля 850 бібліятэк з кніжным фондам каля 4 тыс. экзэмпляраў. Першая навуковая бібліятэка — Фундаментальная бібліятэка Беларускага дзяржаўнага універсітэта — створана ў 1921 годзе. На яе базе пачала працаваць Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У.І.Леніна (цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі). У тыя ж гады ў некаторых абласных цэнтрах (Віцебск, Гомель, Магілёў) з'явіліся яе філіялы. У 1925 годзе ў Мінску заснавана Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа, а ў 1934 годзе сталі арганізоўвацца першыя дзіцячыя бібліятэкі. Але, нягледзячы на інтэнсіўнае развіццё бібліятэчнай справы ў даваенны перыяд, у Рэспубліцы Беларусь яшчэ не існавала сістэмы падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў.

Вялікая Айчынная вайна спыніла далейшы бібліятэчны рух, да таго ж большая частка бібліятэк і іх кніжных фондаў, у тым ліку рукапісаў, была разрабавана фашыстамі і вывезена з краіны.

У 1944 годзе, калі вызваленая ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Беларусь ляжала ў руінах, кіраўніцтва краіны было заклапочана не толькі аднаўленнем эканомікі, але і інтэлектуальнымі, культурнымі, духоўнымі патрэбнасцямі народа. Так узнікла ідэя аб неабходнасці падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі, а практычнай яе рэалізацыяй з'явілася адкрыццё пры Мінскім педагагічным інстытуце (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка) кафедры бібліятэказнаўства і бібліятэчнага факультэта. Менавіта з кафедры бібліятэказнаўства пачалося станаўленне і развіццё вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. У гэтым працэсе, на наш погляд, можна вылучыць некалькі этапаў:

- арганізацыя і першапачатковае станаўленне кафедры бібліятэказнаўства і вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў краіне (1944—1960);
- паступовае развіццё дзейнасці кафедры, вызначанае павелічэннем колькасці штатных выкладчыкаў і вылучэннем з яе складу кафедры бібліяграфіі (1961—1974);
- атрыманне новага статусу кафедры ў сувязі з адкрыццём Мінскага інстытута культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў), фарміраванне асноўнага складу выкладчыкаў-навукоўцаў (1975—2003);
- рэарганізацыя бібліятэчнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў у факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый, а кафедры бібліятэказнаўства — у кафедру менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы (з 2003 г.).

Кожны з этапаў вызначаецца пэўнымі пошукамі і дасягненнямі, характарызуе паступовы шлях развіцця кафедры і адначасова вышэйшай бібліятэчнай адукацыі. Звернемся да яе вытокаў.

Узначаліў кафедру бібліятэказнаўства і кіраваў ёю на працягу дзевяці гадоў (1944—1952) выдатны бібліятэказнаўца і бібліёграф, дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І.Леніна *Іосіф Бенцыяновіч Сіманоўскі*. Менавіта ён унёс неацэнны ўклад у станаўленне бібліятэчнай справы ў Беларусі, стварыў «падмурак» кафедры, быў першым яе выкладчыкам [2]. Ён сфарміраваў першы штат кафедры: запрасіў выкладчыкаў з бібліятэчных інстытутаў Масквы і Ленінграда, вопытных практыкаў-супрацоўнікаў Дзяржаўнай бібліятэкі БССР [3]. У 1949/1950 навучальным годзе на кафедры працавалі 3 штатныя выкладчыкі і 4 сумяшчальнікі.

Вялікую ролю ў станаўленні кафедры сыгралі вопытныя старшыя выкладчыкі, якія затым шмат гадоў працавалі ў бібліятэчнай адукацыі: К.С.Верабей, К.Г.Маўрычава, Н.М.Калоска, В.П.Іванова-Буракова. Яны распрацоўвалі і чыталі першыя спецыяльныя дысцыпліны: «Бібліятэчныя каталогі» (К.С.Верабей), «Работа з чытачамі» (К.Г.Маўрычава), «Гісторыя бібліятэчнай справы» (Н.М.Калоска).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З 1952 года па 1961 год узначальваў кафедру дацэнт М.Ц.Талкачоў. Гэты перыяд адметны пачаткам навуковых даследаванняў выкладчыкаў кафедры. Іх першыя публікацыі знайшлі адлюстраванне на старонках усесаюзнага спецыяльнага часопіса «Библиотекарь» (1957, 1959, 1961), у «Вучоных запісках» Мінскага педагагічнага інстытута (1957), у матэрыялах розных навуковых і навукова-практычных канферэнцый.

Развіццё бібліятэчнай справы на Беларусі патрабавала далейшага павышэння ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў. Кіраўніцтвам інстытута і факультэта было вырашана вылучыць з кафедры бібліятэказнаўства кафедру бібліяграфіі. Загадчыкам яе стаў М.Ц.Талкачоў, кафедру бібліятэказнаўства ўзначаліла В.П.Іванова-Буракова.

З гэтай падзеі пачаўся другі этап развіцця бібліятэчнага факультэта, а разам з ім і кафедры бібліятэказнаўства [4]. Ён характарызуецца папаўненнем яе кадрамі з вучонымі ступенямі і далейшым удасканаленнем навукова-даследчай дзейнасці. З'явілася магчымасць падрыхтоўкі высокакваліфікаваных выкладчыкаў праз мэтавую аспірантуру інстытутаў культуры Масквы і Ленінграда.

Першым выкладчыкам, скончыўшым мэтавую аспірантуру Маскоўскага інстытута культуры і абараніўшым кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», стала М.І.Пакала. Яе шматгадовая педагагічная дзейнасць на кафедры (з 1958 г. па 1992 г.) і разнастайныя навукова-даследчыя пошукі далі добры вынік: распрацаваны першыя вучэбныя праграмы па дысцыплінах «Бібліятэчныя фонды» і «Гісторыя бібліятэчнай справы ў БССР», а неўзабаве выдадзены аднайменныя падручнікі для студэнтаў [5; 6].

Імпульсам да навукова-даследчай дзейнасці кафедры стала магчымасць публікацыі матэрыялаў у беларускім (рэспубліканскім) прафесійным навуковым зборніку «Пытанні бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства» (заснаваны ў 1972 г.). Выкладчыкі кафедры прымалі актыўны ўдзел у выданні манументальных даведнікаў «Бібліятэчная справа ў БССР. Дакументы і матэрыялы, 1918–1941 гг.», «Бібліятэчная справа ў БССР. Дакументы і матэрыялы, 1941–1958 гг.». Адначасова рабіліся першыя крокі па даследаванні педагагічных асноў бібліятэчнага абслугоўвання чытачоў. Узначальвалі кафедру ў тыя гады кандыдат педагагічных навук, дацэнт Н.М.Калоска, затым кандыдат гістарычных навук, дацэнт В.Ф.Якіменка.

Такім чынам, напрыканцы другога этапа развіцця кафедры значна ўзрос яе навуковы патэнцыял, убачылі свет беларускія вучэбныя дапаможнікі, вучэбна-метадычныя распрацоўкі, адбылося тэарэтычнае асэнсаванне разнастайных кірункаў бібліятэчнай работы, што спрыяла павышэнню якасці выкладання спецыяльных дысцыплін.

У гэты ж перыяд змястоўна мяняецца і спецыфіка падрыхтоўкі спецыялістаў: з універсальнай, разлічанай у асноўным на патрэбы публічных бібліятэк, яна становіцца спецыялізаванай. Кафедра рыхтуе бібліятэкараў па спецыялізацыях «масавыя і навуковыя бібліятэкі» і «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі».

Наступны этап развіцця кафедры звязаны з адкрыццём у 1975 годзе на базе бібліятэчнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага і аддзялення культасветработы Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Мінскага інстытута культуры (у 1993 г. ён пераўтвораны ў Беларускі універсітэт культуры, а ў 2004 г. – ва ўстанову адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў») [7]. Кафедра набывае новы статус. Яна становіцца на факультэце вядучай і цесна супрацоўнічае з новымі кафедрамі – тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі, а крыху пазней з кафедрай дзіцячай літаратуры і бібліятэчнай работы з дзецьмі.

Выкладчыкі кафедры распрацоўваюць праблемы бібліятэказнаўства, стымулююць навукова-даследчую работу студэнтаў. Вядуцца комплексныя даследаванні:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Развіццё бібліятэчнай справы ў Беларусі» (1981–1985); «Бібліятэчнае абслугоўванне насельніцтва РБ» (1986–1990); «Кніга і чытанне ў сістэме міжнацыянальных стасункаў» (1991–1995); «Бібліятэчная справа ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць» (1996–2000); «Фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь і іх кадравага патэнцыялу: гісторыя, сучаснасць» (2001–2005). Ролю навуковага кіраўніка кафедральных даследаванняў выконвае кандыдат педагагічных навук, дацэнт Л.А.Дзямешка.

Пашыраецца тэматычная разнастайнасць навуковых прац, выдаюцца манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, якія дазваляюць удасканаліць падрыхтоўку спецыялістаў бібліятэчнай справы.

На працягу 1970–1990-х гадоў выходзяць з друку манаграфіі «Савецкі рабочы-чытач», «Савецкі селянін-чытач» (Л.І.Пятровічава), «Інтэрнацыянальнае выхаванне моладзі» (Л.А.Дзямешка), «Роля бібліятэкі ПТВ у прафесійным і духоўным станаўленні маладых рабочых» (Н.У.Клімянкова), дэпаніраваны манаграфічны зборнік «Бібліятэчная справа ў Беларускай ССР», кафедральная манаграфія «Бібліятэчная справа ў Рэспубліцы Беларусь: здабыткі і перспектывы», манаграфія «Дзейнасць устаноў культуры па мінімізацыі наступстваў Чарнобыльскай трагедыі» (у сааўтарах – У.А.Акуліч, С.А.Паўлава).

Можна ўпэўнена адзначыць, што гэта быў сапраўдны росквіт навукова-даследчай работы кафедры. Узначальваў яе ў гэты перыяд кандыдат педагагічных навук, дацэнт М.В.Іваноў.

Адначасова ўдасканальваецца вучэбная дзейнасць. Кожныя пяць гадоў удакладняюцца вучэбныя планы. Некаторыя курсы цалкам трансфармуюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. Кафедра забяспечвае выкладанне курсаў «Бібліятэказнаўства: тэорыя»; «Бібліятэказнаўства: гісторыя»; «Каталагізацыя дакументаў»; «Бібліятэчныя фонды»; «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства»; «Абслугоўванне чытачоў»; «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг»; «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент» і інш.

Падрыхтоўка студэнтаў вядзецца па спецыялізацыях: «публічныя бібліятэкі»; «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі»; «бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура»; «менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы». Асаблівая ўвага надаецца падрыхтоўцы бібліятэкараў для публічных, дзіцячых і школьных бібліятэк, патрабаванні да дзейнасці якіх значна ўзраслі.

Развіццё бібліятэчнай справы абумовіла ўвядзенне новых спецыялізацый. Так, у 1994 годзе з'явілася спецыялізацыя «маркетынг бібліятэчнай справы», студэнты якой рыхтуюцца да выканання функцый менеджэра ў органах кіравання бібліятэчнай справай, да працы ў аддзелах маркетынгу і рэкламы бібліятэк, на кіруючых пасадах службаў і структурных падраздзяленняў бібліятэчных устаноў і іншых арганізацый сістэмы дакументных камунікацый. У гэтым жа годзе была ўведзена спецыялізацыя «бібліятэказнаўства, бібліяграфія і беларуская мова і літаратура» з прысваеннем дадатковай кваліфікацыі «выкладчык беларускай мовы і літаратуры».

Шмат увагі ўдзялялася таксама падрыхтоўцы вучэбна-метадычных матэрыялаў: выдадзены вучэбны дапаможнік «Бібліятэчнае абслугоўванне» (Л.А.Дзямешка, Н.У.Клімянкова, С.А.Паўлава), «Бібліятэказнаўства: тэорыя бібліятэчнай справы» (Р.С.Матульскі), «Бібліятэчныя каталогі» (Н.А.Ляйко, Л.І.Казлоўская, Р.А.Ролева), «Бібліятэка і вольны час» (Л.А.Дзямешка), «Табліцы для дзіцячых і школьных бібліятэк: бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя» (Н.А.Ляйко, А.І.Фядорына), хрэстаматыя «Заканадаўчыя, рэгламентуючыя і статыстычныя матэрыялы па бібліятэчнай справе» (Р.С.Матульскі), даведнік «Бібліятэчная справа ў Рэспубліцы Беларусь» (Р.С.Матульскі).

Кафедра наладзіла цеснае супрацоўніцтва з замежжам: з Сафійскім і ВелікаТырнаўскім універсітэтамі (Бал-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гарыя), Варшаўскім і Ягелонскім універсітэтамі (Польшча), Вышэйшай школай бібліятэчнай і інфармацыйнай справы ў Штутгарце (Германія), Дагестанскім універсітэтам, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Нідэрландаў. Вынікамі ўзаемадзеяння сталі выязная азнаямленча-вытворчая практыка студэнтаў у гэтых краінах; стажыроўкі выкладчыкаў у бібліятэках і ВНУ замежжа; сумесныя міжнародныя канферэнцыі па праблемах агульных даследаванняў («Польская кніга і чытач на Беларусі», «Беларуская кніга і чытач у Польшчы»); правядзенне лекцый ва універсітэтах замежных краін; шматлікія публікацыі ў замежным друку. Загадчыкам кафедры ў той час працуе кандыдат гістарычных навук, дацэнт У.А.Акуліч.

Такім чынам, трэці этап развіцця кафедры характарызуецца пашырэннем сферы навукова-даследчых, вучэбна-метадычных інтарэсаў і пэўнымі дасягненнямі. Вось некаторыя з іх:

- прапанаваны і апрабаваны сістэма і алгарытм вывучэння курсаў «Сусветная гісторыя бібліятэчнай справы», «Бібліятэчны фандрэйзінг» (дацэнт – У.А.Акуліч);
- распрацавана тэрміналогія ў галіне бібліятэчнай справы, што адлюстравана ў тэрміналагічных слоўніках (у сааўтарах – прафесар Л.А.Дзямешка);
- абагульнена заканадаўчая база бібліятэчнай справы (дацэнт – Р.С.Матульскі);
- распрацавана методыка падрыхтоўкі прэзентацыйных матэрыялаў у вучэбным працэсе з дапамогай POWER POINT (дацэнт – С.А.Паўлава);
- пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры абаронены 4 кандыдацкія дысертацыі (навуковыя кіраўнікі – Л.А.Дзямешка, Н.У.Клімянкова, Н.А.Ляйко);
- абаронена першая доктарская дысертацыя «Бібліятэка як сацыяльны інстытут: тэарэтыка-метадалагічны аспект» (дацэнт – Р.С.Матульскі);
- падрыхтавана аснова для адкрыцця пры універсітэце факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў (першы дэкан яго – дацэнт Н.В.Алянюк).

З 2003 года пачаўся новы этап у развіцці кафедры і звязаны ён з рэарганізацыяй



***Выкладчыкі кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў (загадчык кафедры – С.В.Зыгмантовіч (першы рад, у цэнтры))***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

факультэта. Кафедра бібліятэказнаўства была перайменавана ў кафедру менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, узначальвае яе кандыдат педагагічных навук, дацэнт С.В.Зыгмантовіч. Працуюць на кафедры 9 выкладчыкаў, у тым ліку 2 прафесары, 6 дацэнтаў, 1 старшы выкладчык.

Набыццё кафедрай новай назвы і статусу з'явілася адэкватнай рэакцыяй на сацыяльна-культурныя парадыгмы развіцця бібліятэчнай справы, бягучыя патрэбнасці сучаснай айчыннай бібліятэчнай практыкі, звязаныя з неабходнасцю падрыхтоўкі спецыялістаў, якія павінны валодаць грунтоўнымі ведамі ў сферы менеджменту бібліятэчнай справы. Сёння ад бібліятэкараў патрабуюцца больш шырокае бачанне галіновых праблем, удзел у развіцці грамадскіх сувязей бібліятэк, праектнай, прадпрымальніцкай дзейнасці, прыцягненні пазабюджэтных сродкаў; валоданне тэхналагічнымі і эканамічнымі, псіхолага-педагагічнымі ведамі, навыкамі і ўменнямі працы ў калектыве. Увядзенне ў агульнарэспубліканскі класіфікатар спецыяльнасцей і спецыялізацый падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй напрамку «менеджмент» па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» і адпаведна прысваенне часткі выпускнікоў факультэта кваліфікацыі «бібліятэкар-бібліёграф, менеджэр» абумовілі не толькі арганізацыйныя змены, але і перагляд канцэптуальных падыходаў да зместу выкладання.

Выкладчыкамі распрацавана сістэмная канцэпцыя базавай упраўленчай падрыхтоўкі студэнтаў адпаведнай кваліфікацыі з уключэннем цыкла інавацыйных курсаў, прадугледжаны спецыяльныя курсы (дысцыпліны спецыялізацый). Фундаментальная частка профільнай упраўленчай падрыхтоўкі рэалізуецца праз выкладанне такіх дысцыплін, як «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг», «Інфармацыйны рынак». Студэнты таксама атрымліваюць веды па «Тэхналагічным бібліятэчным менеджменце», «Інавацыйным бібліятэчным менеджменце», «Фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк», «Прававым забеспячэнні дзейнасці бібліятэк», «Бібліятэчнай статыстыцы», «Бібліятэчным фандрэйзінгу», «Паблік-рылейшнз і бібліятэчнай рэкламе», «Псіхалогіі кіравання», «Кіраванні персаналам бібліятэкі» і інш.

Акрамя таго, кафедра з'яўляецца выпускаючай для шэрага спецыялізацый: «маркетынг бібліятэчнай справы», «бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва», «культурна-дасугавая дзейнасць бібліятэк», «кнігазнаўства і менеджмент кніжнага гандлю».

Выкладчыкі кафедры шмат увагі надаюць вучэбна-метадычнаму забеспячэнню навучальнага працэсу, распрацоўцы і ўкараненню ў вучэбны працэс новых педагагічных і інфармацыйных тэхналогій. Выдадзены шэраг вучэбных дапаможнікаў, якім прысвоены грыф Міністэрства адукацыі: «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці», «Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі» (С.В.Зыгмантовіч), «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» (Л.А.Дзямешка, С.А.Паўлава), «Тэхналагічны бібліятэчны менеджмент» (Л.І.Ракавецкая), «Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк» (Ю.А.Пераверзева), «Уводзіны ў спецыяльнасць» (С.А.Паўлава). Вялікая работа праведзена па падрыхтоўцы тыпавых вучэбных праграм, тэкстаў лекцый, вучэбна-метадычных комплексаў для электроннай бібліятэкі ўніверсітэта. Сярод інавацыйных педагагічных тэхналогій: праектная і праблемна-сітуацыйная методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін і арганізацыі самастойнай работы студэнтаў; напаўненне вучэбнага працэсу практыка-арыентаванымі тэхналогіямі і заданнямі; прымяненне такіх актыўных формаў навучання, як ролевыя і дзелавыя гульні, трэнінгі; вырашэнне вытворчых сітуацый; дыялогава-дыскусійныя метады; метады «кейсаў», індывідуальныя заданні; рэйтынгавы кантроль вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таў, выкарыстанне тэстаў, прэзентацыйных матэрыялаў і інш.

Значна пашырыць кола нацыянальных выданняў нашай краіны і кампенсаваць недахоп вучэбных і метадычных матэрыялаў, падрыхтаваных на аснове беларусазнаўчай тэматыкі для спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, дазваляе ўдзел выкладчыкаў у рэалізацыі праекта «Прафесіяналам бібліятэчнай справы», ініцыіраванага бібліятэкай БДУ культуры і мастацтваў і выдавецтвам «Новое знание». У 2008–2009 гадах выйшлі з друку навукова-практычныя дапаможнікі «Правовое обеспечение деятельности библиотек Республики Беларусь» (Ю.М.Галкоўская), «Менеджмент школьной библиотеки» (Л.А.Дзямешка), «Формирование кадровых ресурсов библиотек в новой информационной среде» (І.Б.Стралкова). У друку знаходзяцца: «Падрыхтоўка бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэкамі» (С.В.Зыгмантовіч), «Бібліятэчныя зносіны» (Н.У.Клімянкова), «Бібліятэчная сацыяномія» (Н.Я.Петушка), «Бібліятэчны фандрэйзінг» (Ю.А.Пераверзева), «Бібліятэка і экалогія: пытанні выхавання падлеткаў» (В.А.Какшынская).

Гэтыя прыклады яскрава сведчаць не толькі аб вялікай ролі выкладчыкаў у забеспячэнні вучэбнага працэсу, але і аб іх значным укладзе ў развіццё айчыннага бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, аб інтэграцыйных працэсах у навуковай, вучэбнай і практычнай дзейнасці.

Кафедра і на сучасным этапе развіцця працягвае распрацоўку комплексных навукова-даследчых тэм. У 2006 годзе паспяхова завершана міжкафедральная тэма «Фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь і іх кадравага патэнцыялу: гісторыя і сучаснасць» (2001–2005), па выніках якой дэпаніравана ў БелІСА калектыўная манаграфія. Сярод даследчых тэм: прадстаўленне інфармацыйных рэсурсаў карыстальнікам бібліятэк; падрыхтоўка кадраў; фарміраванне сістэмы бесперапыннай адукацыі бібліятэчных кадраў; вывучэнне бібліятэчнай прафесіі, сацыяльнай ролі бібліятэкара ў грамадстве; псіхолага-педагагічныя аспекты ўзаемадзеяння бібліятэкара з чытачом; інфармацыйныя рэсурсы для дзяцей бібліятэк Беларусі і іх кадравы патэнцыял.

Сярод перспектыўных планаў дзейнасці кафедры – комплексная распрацоўка пытанняў бібліятэчнай педагогікі, фарміраванне навуковай школы ў межах гэтага напрамку, падрыхтоўка вучэбных, практычных выданняў як для студэнтаў, так і для бібліятэчных спецыялістаў краіны.

Дзейнасць кафедры як заснавальніцы вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў краіне ва ўсе згаданыя перыяды, вядома, адбывалася ў кантэксце змен і рэарганізацыі факультэта падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчнай справы. Да 1993 года ён насіў назву «бібліятэчны факультэт», затым «факультэт бібліятэказнаўства і бібліяграфіі». Дэканамі ў розныя гады працавалі І.Б.Сіманоўскі, В.І.Іванова, К.С.Верабей, А.С.Галуза, В.Е.Лявончыкаў, У.А.Фамін.

У 1993 годзе факультэт перайменаваны ў факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (дэканы – Р.А.Ровіна, А.А.Трусаў, Р.С.Матульскі). З 2003 года ён носіць назву «факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый» (дэкан – М.А.Яцэвіч, кандыдат педагагічных навук, прафесар). Сёння тут працуюць кафедры: тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый (загадчык – В.Е.Лявончыкаў); інфармацыйных рэсурсаў (загадчык – В.В.Нешытой, доктар тэхнічных навук); менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы (загадчык – С.В.Зыгмантовіч, кандыдат педагагічных навук, дацэнт). Факультэту падначалены таксама кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства (загадчык – А.І.Смолік, доктар культуралогіі, прафесар), замежных моў (загадчык – М.І.Кускоў, кандыдат філалагічных навук, дацэнт), беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры (загадчык – Г.К.Тычко, доктар філалагічных навук, прафесар).

Выкладчыкі факультэта актыўна ўзае-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадзейнічаюць з бібліятэкамі краіны. Прынцыпы супрацоўніцтва заснаваны на зацікаўленасці бакоў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў бібліятэчнай справы, развіцці айчыннай навукі. Супрацоўніцтва распаўсюджваецца як на вучэбны працэс, так і на павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў, удзел у рабоце грамадскіх прафесійных аб'яднанняў, рэцэнзаванне работ, падрыхтаваных супрацоўнікамі бібліятэк, і інш.

Практыка-арыентаваны характар навучання будучых спецыялістаў бібліятэчнай справы рэалізуецца шляхам правядзення заняткаў і праходжання студэнтамі вытворчай і перaддыпломнай практыкі на базе вядучых бібліятэк, выканання курсавых, дыпломных работ, а таксама падрыхтоўкі рэкламных матэрыялаў, праектаў па заказах бібліятэк [8]. Больш мэтанакіравана і сістэматычна такая работа вядзецца ў межах вучэбна-навукова-вытворчых комплексаў, якія ствараюцца на базе кафедраў факультэта і вядучых бібліятэк. У адпаведнасці з распрацаваным і зацверджаным «Палажэннем аб вучэбна-навукова-вытворчым комплексе» ажыццяўляецца актыўнае супрацоўніцтва з бібліятэкай БДУ культуры і мастацтваў, заключана дамова з Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкай імя М.Астроўскага і інш. Рэалізацыя праектаў стасуецца з палажэннямі Дзяржаўнай праграмы развіцця вышэйшай адукацыі на 2008–2012 гады і на перспектыву да 2015 года.

Падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў з 2008 года адбываецца згодна з новымі адукацыйнымі стандартамі. Першая ступень яе прадугледжвае чатырохгадовы тэрмін навучання, рэалізацыю кампетэнтнаснага падыходу, накіраванага на фарміраванне ў будучых спецыялістаў прафесійных (вытворча-тэхнічных, сацыяльна-культурных, навукова-метадычных, навукова-даследчых, арганізацыйна-кіраўніцкіх, педагагічных, інавацыйных), адукацыйных, сацыяльна-асобасных кампетэнцый. Кампетэнтнасны падыход азначае паступовую пераарыентацыю дамінуючай адукацыйнай парадыгмы з пераважнай трансляцыяй ведаў на стварэнне ўмоў для авалодання комплексам кампетэнцый, якія дазваляюць вызначыць патэнцыял, здольнасці выпускніка да выжывання і ўстойлівай жыццядзейнасці ва ўмовах сучаснай шматфактарнай сацыяльна-палітычнай, рыначна-эканамічнай, інфармацыйна і камунікацыйна насычанай прасторы. Сярод складаных пытанняў, якія вырашаюцца прафесарска-выкладчыцкім складам усіх кафедраў факультэта, — абнаўленне зместу і структуры вучэбных праграм; распрацоўка новага пакалення вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу; укараненне інавацыйных камп'ютэрных і сацыяльных тэхналогій навучання, накіраваных на павышэнне пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў.

Ва універсітэце працуе Савет па абароне дысертацый, у тым ліку па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства», адкрыты магістратура, аспірантура, дактарантура. Тэматыка навуковых даследаванняў магістрантаў і аспірантаў звязана з актуальнымі праблемамі: фарміраваннем камунікатыўнай кампетэнтнасці бібліятэкараў, кадравага патэнцыялу бібліятэк ВНУ краіны, адаптацыяй маладых спецыялістаў да работы ў інфармацыйна-бібліятэчных установах, экалагічным выхаваннем чытачоў-падлеткаў, падрыхтоўкай і выкарыстаннем бібліяграфічнай інфармацыі, работай публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ) па фарміраванні прававой культуры насельніцтва і інш.

На факультэце навучаюцца звыш 1350 чалавек (на дзённай і на завочнай формах навучання). Навуковай працай ахоплены больш за 70% студэнтаў. Штогод яны прадстаўляюць каля 200 дакладаў на студэнцкія навуковыя канферэнцыі універсітэта, іншых навучальных установ краіны. Аб эфектыўнасці навуковай работы сведчаць вынікі штогадовага рэспуб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў, на які за апошнія пяць гадоў толькі ад кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы былі прадстаўлены 57 работ, з іх 19 (33%) атрымалі дыплом I катэгорыі, астатнія – дыпломы II і III катэгорый.

Да свайго 65-годдзя факультэт падышоў са значнымі вынікамі. За часы існавання ён вырас у навукова-педагагічны, культурна-асветніцкі цэнтр, які рыхтуе па-сапраўднаму высокакваліфікаваных спецыялістаў – прафесіяналаў бібліятэчна-інфармацыйнай справы краіны.


1. *Шышкін, У.А.* Бібліятэкі Беларусі / У.А.Шышкін // Беларуская культура сёння. – Мінск, 2007. – С. 58–67.
2. *Симановский, И.Б.* Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской социалистической революции / И.Б.Симановский // 40 лет библиотечного строительства в СССР: доклады научной конференции, 23–26 декабря 1957 г. – М., 1958. – С. 191–286.
3. *Минченя, Т.Н.* Белоруссия: Национальная библиотека / Т.Н.Минченя // Библиотечная энциклопедия. – М.: Пашков дом, 2007. – С. 82–84.
4. *Акулич, В.А.* Белоруссия: библиотечное дело / В.А.Акулич, Н.В.Клименкова // Библиотечная энциклопедия. – М., 2007. – С. 80–82.
5. *Покало, М.И.* Библиотечные фонды / М.И.Покало. – Минск: Выш. школа, 1972. – 84 с.
6. *Покало, М.И.* История библиотечного дела в БССР / М.И.Покало. – Минск: Выш. школа, 1986. – 198 с.
7. Хроніка асноўных падзей БДУ культуры і мастацтваў. 1975–2005 / М.А.Бяспалая, Н.А.Ляйко, Л.А.Дзямешка. – Мінск: БДУ культуры і мастацтваў, 2005. – 49 с.
8. *Дзямешка, Л.А.* Бібліятэка – універсітэт: супрацоўніцтва ў навучальным працэсе / Л.А.Дзямешка, С.А.Паўлава // Бібліятэчны свет. – 2007. – № 1. – С. 20–21.



***Л.А.Дзямешка**, прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў,*

***С.В.Зыгмантовіч**, загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, дацэнт*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ